# АСАБЛІВАСЦІ АЙКАНІМІІ ТУРАЎШЧЫНЫ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Голад Г.М.*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазырь)*
***Навуковы кіраўнік –*** *В.В. Шур, д-р філал. навук, прафесар*

Айконімы Тураўшчыны маюць даўнюю традыцыю вывучэння. Даследаваннямі гэтых адзінак займаліся А. Рогалёў, А. Крывіцкі, Г. Цыхун, В. Лемцюгова, В. Жучкевіч, І. Яшкін, Н. Багамольнікава і інш. Багацце айканіміі абумоўлена, галоўным чынам, геаграфічным становішчам былога Тураўскага княства, на тэрыторыі якога знаходзіцца сучасны Жыткавіцкі раён.

Жыткавіцкі раён як частка Тураўшчыны ўключае горад абласнога падпарадкавання Жыткавічы, г. Тураў, 107 сельскіх населеных пунктаў, кожны з іх мае адну або некалькі назваў. Паводле лексіка-семантычнай характарыстыкі асноў айконімы Тураўшчыны падзяляюцца на: 1) айконімы адапелятыўнага паходжання (*Буда, Вільча, Палянка, Града, Старушкі*) – гэта найбольш прадуктыўная група (77,6%); 2) айконімы адантрапанімнага паходжання (*Браніслаў, Ленін, Людзяневічы, Пухавічы, Тураў*) – значна меншая група (17,7%); 3) айконімы адгідранімнага паходжання – самая нешматлікая група (*Белае, Марохарава, Науць, Чырвонае, Бярэзіна* – 4,7%).

У айканіміі рэгіёна найбольш прадуктыўнымі і рэгулярнымі з'яўляюцца наступныя тапафарманты: ***-ічы***: *Залюцічы, Чэрнічы, Гулевічы, Дзякавічы, Ляхавічы, Паласцевічы, Юркевічы* (14,2%); ***-ын, -ан-, -ін-***: *Азяраны, Вятчын, Бярэзіна* (5,6%); ***-н-***: *Азёрны, Крэмнае, Рудня, Ельна* (5,6%); ***-ава-***: *Баравая, Грабава, Марохарава* (4,7%); ***-к-***: *Боркі, Сялко, Хвойка* (3,7%); ***-je*** (усходнеславянскі суфікс, які ў беларускай мове трансфармаваўся, выклікаўшы падаўжэнне зычных): *Заброддзе, Загацце, Запясочча* (5,6%). Асноўную групу складаюць айконімы, утвораныя семантычным спосабам: *Буда, Града, Найда, Пагост* (37,7%).

Паводле структуры выдзяляюцца айконімы простыя (88,8%): *Востранка, Сялко, Хільчыцы;* састаўныя (11,2%), якія пераважна

МГПУ им. И.П.Шамякина

ўжываюцца ў спалучэнні “прыметнік + назоўнік”: *Вялікія Сцяблевічы, Новыя Мілевічы, Хлупінская Буда.* Сярод айконімаў Тураўшчыны выдзяляюцца тыя, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку: *Буда, Вільча, Верасніца, Пагост, Хваенск* (68%); у форме множнага ліку: *Беразнякі, Ляхавічы, Азяраны, Пасталы, Мілевічы* (32%).

Аналіз матывацыі айконімаў Тураўшчыны, ідэй, якія пакладзены ў аснову намінацый, дазваляе вызначыць наступныя іх тыпы: антрапаайконімы: *Браніслаў, Ленін, Цімашэвічы, Пухавічы*; ландшафтныя назвы: *Востранка, Дуброва, Палянка*; айконімы-арыенціры: *Беражцы, Замошша, Перароў*.

Айканімія Тураўшчыны засведчана ў творах беларускіх пісьменнікаў: В. Казько, Г. Дашкевіч, П. Шруба, М. Гамолкі, У. Гаўрыловіча і інш.

МГПУ им. И.П.Шамякина